БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папрауляць перасыланые рукапісы і карэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 49. Менск. Пятніца 24 мая 1918 г. Год I



КАЗІМІР КАСТРАВІЦКІ

іначэй Карусь Каганец

скончыу свой жывот чысты для дабра людзей 20—V—1918 р. прыняушы сьв. Сакрамэнталіі у фальварку Юцкі Койданоускай воласьці; пахован на радзінным цмэнтару у Новаселках.

Даводзяць да ведама жонка, дзеці, браты і сестры.

КАРУСЬ КАГАНЕЦ.

Прышла да нас сумная вестка... Пайшоу да Бога адзін з нашых найстарэйшых піанэрау беларускаго адраджэння, — пісьменнік Каганец.

Жыушы у адным с самых глухіх куткоу Беларусі, наш дарагі і паважаны пісьменнік тварыу свае найлепшыя беларускія песьні, якія цяпер паложаны на музыку: «О Божэ, Спасе наш» і другія. К. Каганец быу адным з залажыцелеу Беларускай Соцыялістычнай Грамады у пачатку 900-х гадоу. Ен так-само быу маляром-артыстам.

У творах К. Каганца адбіваецца тая старасьвецкая Беларусь атуленая пушчамі, лугамі, абвеяная казкамі мінулых зруйнаваных замчышчау беларускіх князеу.

К. Каганец пісау граматыку беларускай мовы у той час, калі яшчэ беларускі друк ні быу афіцыяльна пазволены. Як ідэйна-грамадзкі працаунік Каганец вядомы ні толькі беларускай інтэлігэнцыі, але усім шырокім сфэрам с дзеячоу асьвабадзіцельнаго руху 900-х гадоу.

К. Каганец меу вялікі уплыу на усіх маладых беларускіх пісьменнікау сваім бязмежным каханнем роднаго краю, роднай мовы. Ен лічыцца духоуным бацькам усіх працаунікоу беларускаго руху.

Беларусь цяпер мае вялікую страту. Беларусь у жалобі...

Дарагі сівы наш тату! Тое, што ты пасеяу на Беларускай ніве мы будзем і далей пільнаваць і дагледаць і твой сьветлы дух, твае сьвятыя думкі будуць нашай апорай на зауседы...

Маці Беларусь цябе ні забудзе і твая сьвятая магіла будзе зауседы красаваць венкамі паложанымі тваімі шчырымі братамі па працы і думках...

Хай легкаю будзе табе зямелька!

P. S.—Ад раптоунасьці нісчаснаго здарэння, ад душэунай трывогі, выкліканай сьмерцью нашаго дарагога бацька мы ні можам зараз жа даць поунейшаго апісання яго, што будзе зроблено намі у адным з бліжэйшых нумэроу.

Менск 24/г.

Большэвіцкае самадзержавіе у Вялікаросіі.

Чытаючы Калужскія, Смаленскія, Маскоускія савецкія «Прауды», бачым, што ужо пачаліся перадсмертныя конвульсыі «рэвалюцыі». 14 мая жыдоускі пагром у Смаленску, у Калузе у гэты самы дзень пры пажары Бабруйскаго артылер. складу пачаліся пагромы кватэр, у Звенігорадзе і десятку розных гарадоу робіцца тое самае. Нейкі «Совдеп» спалілі з домам цалкам. Цар-голад ужо душыць самую свабодную у сьвеце рэспубліку. У Смаленску арэштавалі 10 афіцэроу-інстукторoу, бо быццам «буржуі» падгаварываюць на пагромы. У Смаменску гаспадарыць пры гэтым начальнік гарнізону Крывошэін, Пікель, —старыя знаемыя мінчукам рэзалюцыі проціу контр рэвалюцыі, мітынгі, дзе адны красноармейцы, а народныя массы збоку глядзяць з ні[д]аверыем на «большэвіцкае» начальство. Большэвіцкія «Дзержымарды» і нівінных уличных свістуноу, разстрэліваюць на мейсцу; робючы над імі «безпощадное подавленіе реакціи с контрреволюціи» і, можна сказаць, працуюць троха веселей, як даунейшая царская паліцыя. Ні гледзючы на гэта анархія ужо развеліла увесь грамадзянскі организм і эканамічна і палітычна і моральна.

Програма большэвіцкая — перайсьці ад капіталізма да соцыялізму, дзе ні будзе ні багатых, ні бедных, ні прыватнай уласьнасьці,—вельмі пекная утопія. Шырокія массы пайшлі за гэтай абецанкай—зрабіць рай на зямлі.

Кончылося усе тым, што мы усе бачым і ведаем. Глауная брыдкая старана і дэмаралізуючая, гэта тое што дыктатура большэвікоу перэняла усе горшыя фасоны самадзержавія, развіушы сыстэму гвалту і «тыкальнасьці» асобы грамадзяніна і яго маентнасьці да гэркулесовых слупоу. Дарога да дыктатуры рэакцыі там зроблена.

Эўропэізацыя Беларусі.

Беларускі народ, як толькі «камісары» уцяклі с краю, аутаматычна прывеу усе у парадак. Прынцып, напрыклад, прыватнай уласнасьці на зямлю, у народзе інстынктыуна выявіуся і аказалося, што ен ніколі ні црападау. Беларус-уласнік, інакш ен зямлю ні разумеець. свая зямля—свая хата. Для гэтаго ніхто нідзе рэпрэсый ні рабіу на народ. Край засеяуся і працуець, як і у нормальныя часы. Увесь большэвізм прапау без астатку разам з арміей: яна яго тут развела, яна яго с сабой і забрала. Беларусы арганізавалі парадак па валасьцех. Вайна зрабіла на усім сьвеце дэмаралізацыю, у беларусау-селян, яна нічога ні пераменіла у патрыархальным складзе жыцця земляроба. Вайна і рэвалюцыя зрабіла тую добрую працу, што яна расшырыла кругазор ума, палітычна і нацыянальна умудрыла народ, каторы гатовы легка прыняць новыя формы жыцця.

Народ больш асьвядомлены і рэальна чэкаець зямельнае рэформы. I Эуропэйская аграрная рэформа пры нашых вялікіх абшарах легка пройдзе с павышэннем сельска-гаспадарскай культуры і продукцыйнасьці усяго краю.

Лісты з вескі.

I.

Як ні дзіўным можа паказацца гэта зьявішчо, але яно так ёсьць: моладзі у нашых вёсках за час вайны ні убыло а прыбыло. Прыбыло, ні зважаючы, што шмат іпчэ сядзіць яе ў палоні, а шмат ужо і саўсім ні верніцца...

Скуль жа ўзялася гэта моладзь?

Да вайны—с кожнай хаты 1—2 хлапцоў было на так званай «дѣйствительной» службі. Нашых беларусау заганялі у глыб Расіі, або нават у Сыбір русыфікавацца, аткуль і на «пабыуку» трудна было вырвацца. Калі пасьля службы варочаліся да хаты адны, на падмену ішлі другія. Гэтак, залежна ад вялічыні вёскі, колькі дзесяткоў хлапцоў ніхватало.

Апрача гэтаго, за час вайны, выбіралі, як вядома, і падросткаў—ад 18-ці гадоў. Даўней—гэткія падросткі лічыліс за смаркачоў і ў агульна-вясковых справах, ніякога голасу ні мелі, а на вячарынках займалі мейсцы у качарэжніку. Цяпер—гэтыя мітынговыя ваякі, лічучы сябе бывалымі і ўсёзнайкамі, ўсюды водзюць рэй на раўні са старшымі.

I, калі расійскія салдаты, пасьля развалу арміі, старшыя—ішлі ў большэвікі—грабежнікі, малдшыя — запісваліся у краснагвардзейцаў, ваякі—беларусы, каторым ні па нутру гэткія авантуры, хто толькі мог вырвацца—пёр да роднай вёскі.

Ось гэтыя быўшыя «дѣйствительныя» і свежо - выпячэныя салдаты і павялічылі на вёсцы лік моладзіоа на стольки, што пераважылі страты на вайне.

Мушу спомніць і аб дзеўчатах: прыбыло і іх. Даўней—да гадоў 18-ці лічыліся яны падлёткамі, якім бацькі на вячарынкі хадзіць баранілі, хіба каторая вырвіцца пад вакном пастаяць. Такія падлеткі у гутарку са старшымі і хлапцамі ніўдаваліся; умелі толькі, спусьціўшы вочкі, хвартушок у пальцах круціць. Цяпер—гэтыя падлеткі, дзякуючы заработкам у акопах і рожных дарожных і іншых адрадах, так «абцёрліся», што і сталым дзеўкам гатовы форы даць.

Прыбыло і іпчэ аднаго дабра на вёсцы: гадавалых дзяцей, але іх, ні зважаючы нат на цяаперашнія часы, залічаць да моладзі іпчэ нельга і гэта саўсім іншая справа...

Што ж, спытаіцеся, робіць цяпер на весцы ўся гэта чарада моладзі? Аб ўсіх сказаць разўмеецца, трудна. аб нікаторых—магу.

У аднэй хаці чатырох здаровых хлапцоў; адзін с паміж іх у войску падучыўся за шаўца, ну і патрохі шые, а двох—прыглядаюцца, як той шые.

У другой—пяць, як дубоў, хлапцоў; адзін—краўцом стаўся, шые, а чатырох глядзіць на гэто майстэрства.

Прыходзюць і с суседніх хат хлопцы—так сама прыглядацца. Ні падумайце толькі, што ўсе яны прыглядаюцца так, каб самым наўчыцца,—ані думаць: паглядзець, пагаварыць і толькі.

С трэцяй хаты—адзін с паміж хлапцоў некольки месяцаў у санітарах быў; цяпер, тут—стаўся «дохтарам» і ад уселякіх хвароб надта «памагае».

Дык, аб якой рабоці можа быць гутарка у сямьі, дзе ёсьць сам «дохтар?»

Ну, а каб так запрацанаваць, ні кажу ўжо—шаўцу, краўцу, чы дохтару, але тым што толькі прыглядаюцца—на службу пайсьці? і ні важціся —пырсне сьмехам у вочы.

На службу - ні тыя часы! Падзённа—іпчэ так-сяк. Цяпер—5 рубл. у дзень на гаспадарскім хлебі, а прыдзе касьба—5, а то і 10 рубель-

чыкоў за дзень.

— А на жніво, падхопліваюць дзеўчаты, менш пяці рублёў на гаспадарскім хлебі ні пойдзім; і без гэтай ласкі можым абыйсьціся.

Што вёска цяпер ні чыей ласкі ні патрэбуе — то пэўна; ні дарма пікаторыя пахваляюцца, што ні толькі вуглы, а ўсю хату могуць выкляіць грашавымі паперкамі. І на службу пойдуць, разумеецца, толькі тыя, хто ні бачыць ганьбы у працы і рожніцы паміж чыноўнічай службай і хлебаробствам.

Але справа вось у чым: чаму вы, замест прыглядацца да шыла, іголкі, чы дохтарскіх лекаў, ні гляніце хоць на свае уласныя шнуры зямліцы, заваляныя каменнямі; на свае сенажаці, заросшыя лазовымі кустамі?

Іншэ адно пытанне: чаму на гэтых самых шнурах за сахой, чы плугам бачыш тыя самыя, што да вайны і часы яе, згорбляныя, старыкоўскія плечы і пасівеўшыя галовы?

Я. Ш.

Агульныя весткі.

КІЕУ. Гэтман Скоропадзкі быў 19 мая разам з нямецкім, аўстрыяцкімі і баўгарскім прадстаўнікамі пры адкрыцці украінскаго клюбу, каторы ёсьць таварыствам літэратуры і штукарства. Гэтман Скоропадзкі ў мове сказаў, што глаўная яго задача — гэта стварыць дужую нізалежную Украіну па дэмократычных асновах, ды ён маніццаісьці поруч з украінскім народам. Іншыя аратары дзякавалі Нямеччыне за адбудову Украіны і жадалі самаго цеснаго злучэння з Нямеччынай, каторай вельмі шмат абавязаны у культурным, навуковым і тэхнічным адносінах. Нямецкі пасол барон Мумм меў мову, каторую скончыў словам: «Ніхай жыве, расьце і красуе украінскі клюб і Украінская Дзержава! Глаўная задача маладой рэспублікі — гэта сьпешная украінская культурная палітыка і перш-наперш будаванне нацыянальнае украінскае школы.

КІЕУ (В.Т.Б). Соцыял-фэдэраліст Шульгін быўшы міністэр справедлівасьці ў габінэце Голубовіча назначэны маршалкам украінскай дэлегацыі для вядзення перагавораў аб міры з Расіей.

КІЕУ (В.Т.Б.). Архіепіскап Антоні Харкаўскі выбраны мітрапалітам Украіны. Ен быў раней архіепіскопам у Жытоміры.

ПАРЫЖ (В.Т.Б.) Гавас публікуе ноту, у каторай між іншым, кажыцца: Францыя запрапанавала швэйцарскаму ўраду 85 тысяч тонн каменнаго вугля па 150 франкаў за тонну. Швэйнарскі ўрад уступіў згарад нізадаволеньем нямецкаго ўраду і зрабіў умову з Нямеччынай аб дастаўцы вугля. Мы паведамілі швэйцарскі ўрад, што калі Нямеччына скарыстае с свайго палажэння, каб аслабіць сувэрэнітэт Швэйцарыі, што зробіць свой уплыў і на нас самых, дык мы будзем прымушэны бараніць нашыя інтарэсы. У кожным здарэнні мы і на далей астанёмся прыяцелямі швэйцарскаго народу і каб давесьці гэта мы будзем даваць Швэйцарыі і далей вугале, канечна патрэбныя для прэдпрыемстваў, каторыя працюць у Швэйцарыі для нас нашых хаўруснікаў.

ШТОКГОЛЬМ. Адзін рускі параход з 8-ма тысячамі уцекачоў мужчын, жонак і дзяцей найшоў на міну і затануў.

БАЗЭЛЬ. «Гавас» З Лёндону наказываюць, што ўсяго арэштавано 500 ірляндцаў. Між імі ўсе члены парляманту, належачыя да партыі сінфэйнэраў. Дэвалера высланы на ваенны карабель.

БЭРЛІН. Урадовая «Nord Deut Allg Ztg.» наказывае, што заява вэнгерскай газэты Az. Est.» быццам канцлер Бэтман-Гольвх гатоў быў аддаць «маленькую часьць» Лётарынгіі ніпраўдзіва: Нямецкі урад ніколі ні згаджаўся уступіць і малую часьць імпэрскай зямлі.

ЖЭНЭВА. Парыжскі карэспандэнт ««Manchester Gvardian», Дель, каторы пусьціў фальшывую вестку аб пісьме аўстрыяцкаго імпэратара аб уступцы Трыесту ў замену на Сілезію, загадам французскаго ўраду выдален с Франціі.

ВАШЫНГТОН (Рэўтэр). Макаду пазволіў асыгнаваць мільярд доляраў на будоўлю сёлета чыгунак.

ЛОНДОН (Рэўтэр). Міністэр еміных спраў, лёрд Ронда, па жаданне Льлдэй Джорджа узяў сваю адстаўку назад.

БЭРЛІН [В.Т.Б.]. Конгрэс нямецкіх ваенных хаўрусаў на сваім апошнім заседанні прыняў рэзолюцыю, каб у будучыне кожан нямецкі ваенны нізалежна ад партыйнай прыналежнасьці, мог быць прыняты у лік членаў гэтых хаўрусаў.

ЛЮГАНО. «Corr d. Sera» наказывае з Нью-Іорку, што італьянскі лятун Рэньяті зваліўся с самамалетам сыстэмы Копроні на эродроме ў Гэмстэід і забіўся апа смерць. Рэньяті ў лістападзе 1917 году паднёсься на сваім самалёці з 25 асобамі ўверх на 17.000 локцяў. Ен апрацаваў плян пералету над Атлянтыцкім акіянам.

КОПЭНГАГА. Фінляндзкі сойм заседаў першы раз пасьля рэвалюцыі. Міністэр-прэзыдэнт Свінхувуд дзякаваў Швэцыі, Даніі і Норвэгіі за помач. Фінляндзкі народ еў дрэўную кару, каб карміць армію хлебам.

Фінляндзія — нізалежная старонка. Зносіны з Расіяй разарваны, бо большэвікі прызнаюць «чырвоны» урад.

Гр. Маннэргэйм прыехаў у сэнат і выказаў жаданне фінляндзкай арміі, каб Фінляндзія была манархіей.

ЦЮРЫХ. З Ірляндзіі паказываюць, што кіраўнікі сінфэйнараў Дэвалера, гр. Маркевіч, Артур, Грыфіт, Ділон і Косвэйг — арэштаваны.

РОТТЭРДАМ 18 V. Ірляндзкі віцэ-кароль фэльдмаршалак Фрэнч апублікаваў адозву; у каторай між іншым апавешчаецца:

«Нікаторые падданые караля завязалі здрадлівые зносіны з Нямеччынай. Павіннасьць усіх верных падданых — стаяць у гэтай вайне за свой урад. Я аблягчу Ірляндзкім падданым магчымасьць паступлення у армію. Калі чысло Ірляндцаў у англіцкай арміі, пасьля гэтаго будзе пропорцыянальным чыслу жыхароў Ірляндзіі, дык ні будзе патрэбным уводзіць у Ірляндзіі прымусовую службу».

Весткі з Расіі.

Вядомы палітычны пісьменнік, праф. Ястроў, у тыднёвым журналі «Deusche Palitik» адзначывае, што у нікаторай меры здарэнні у Расіі з апошняго часу падобны да здарэнняў у Рымскай імпэрыі ў IV і V сталецці. У зьвязку з гэтым трэба зьмяніць назовы і дапасаваць да перамяніўшыхся варункаў. Аб «Расіі» больш нельга гаварыць. Кажучы аб здарэннях ў межах колішняй царскай Расіі мы замест слова «Расія» павінны казаць «Усходняя Эўропа», або «быўшая Расійская імпэрыя», ці «землі быўшых расійскіх цароў». Кажучы аб Вялікаросіі можа гожа было-б карацей казаць аб Маскве: «Масква», або «маскоўскі урад згодзіўся на гэта». У кожным прыпадку ужываць імя Расіі дзеля таго, што осталося ад Расіі, было бы абмылкай як с палітычнаго, так географічнаго і этнографічнаго пагляду.

ШТОКГОЛЬМ. Ленін паслаў усім саветам і еміным камітэтам срочную тэлеграму, кажучы, што Пецярбург знаходзіцца ў катастрофальным палажэнні. Хлеба німа. Раздаюцца апошкі хлеба і бульбяной мукі. Сталіца знаходзіцца, напярэдодні, пагібелі. Контр-рэвалюцыя паднімае ўжо галаву і падбівае нізадаволеныя массы проці народных камісараў. «Нашы ворагі стараюцца вымарыць голадам урад саветаў. Толькі дружная праца ўсіх можа тут памагчы і выратаваць Пецярбург. Адзіннаці соцыялістычнай рэспублікі я прызываю памагчы Пецярбургу.»

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ (Аг. Міллі). Большэвікі ў Баку атрымалі значную падмогу с Туркестану і пачалі наступленне. Мусульмане утрацілі Баку, ні гледзючы на помач з Дагестану і Грузіі. Большэвіцкіе банды наступаюць далей.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ [В.Т.Б.] Казакі ў ваколіцах Кубані наступаюць на мусульман. Большэвікі занялі Петроўск і стараюцца прарваціа праз яр, які вядзе з Владыкаўказу ў Тыфліс.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

На хадатайство губэрнскаго прысуцтвія перад нямецкім граданачальствам аб адчыненні зноў выкупна-сэрвітутнаго аддзелу, або, замест гэтаго, аб выдачы быўш. служачым яго заштатнай платы атрымалі атказ. На пазднейшае хадатайство аб тым жэ адвета пакуль што німа.

У юбілейным домі, перайшоўшым ад праваслаўнаго духоўнаго ведамства пад кіраўніцтво Беларускаго народнаго прэдстаўніцтва, пачаўся сьпешны рэмонт пад даглядам старшыні рады старэйшых беларускаго клюбу Ф. Вернікоўскаго.

У міліцыі. Увесь цэнтральны штаб раскасыраваны. Вучастковыя камісары зьменены усе, апрача двух.

У памешканне штаба пераходзіць упраўленне ваеннаго паліцмэйстэра, там жа уладжываецца новы пасад судзьзі дзеля адпавецальнасьці за працівазаконныя цэны.

С касаваннем штаба міліцыі і мешчанскай управы справай выдачы паспартаў будзе ведаць грамадзянскі аддзел менскаго самаупраўлення.

У аддзелі крыміна-паліцыі так-сама будуць праведзены патрэбныя рэформы.

Меські арэштны дом пераходзіць у веданне нямецкіх уласьцей.

Рэгістрацыя насэлення места 3-й, 4-ай і 5-й часьцей у найболей блізкіх у іх ваколіцах мясных крам пачатая с серады 22 мая, заканчываецца сягоння г. з. у пятніцу, 24 мая, вечарам.

Фактычная выдача мяса маючым боны пачынаецца заўтра г. з. у суботу, 25 мая і працоўжыцца да аўторка, а у выпадку ніусьпеха — і пазьней.

Дробныя боны усяго на 2,000,000 руб. ухвалено выпусьціць губ. земствам, пасьля пацьвярджэння гэтаго нямецкім граданачальствам.

Для ліквідацыі спраў быўш. «У. З. С.» губ. зем. сабраннем назначана асобая кантрольна-рэвізыйная камісія, ні гледзючы на усе стараннi «вядомаго земгусарскаго» заправілы, правесьці ліквідацыю пад шумок, дзеля чаго гэто пытанне ім было прыурочэно для разгляду пад поўнач с грудай дзел, дакумэнтаў і справак.

А усе-ж такі камісія назначана.

У зноў выбраную губ. зем. управу пасьля гарачых і сьмешных канфліктаў паміж двума напрамкамі, выбраны: старшыней — Ярошэвіч, заменяючым яго — Дземідзецкі-Дземідовіч (б. памоцнікам губ. камісара), членамі — Вашчынін (б. земскі начальнік менскаго павету с крайне правых), Ковалік (старшыня губ. земельняго камітэту) Вайнштэйн (старшыня думы), Злобін і Прокаповіч.

На гандлевым плацу у сераду, 22 мая, малако кіслае прадавалося па 1 р. кварта.

На дровы і сено — ранейшыя цэны.

Першы дзень павярачнай рэгістрацыі афіцэраў і салдат заўтра, г. з. 25 мая, ад 8 гадз. рання.

Тутэйшыя пэнсыянэры, с прычын зацягнутай невыплаты казначэйствам пэнсіі, пераживаюць вельмі труднае становішчо.

У менскай амбулаторыі завеўся дзіўны звычай пачынаць прыем па *агульным* хваробамм с поўдня, г. з. с часу праходу дохтара, калі ен канчае у сябе дома прыватныя прыемы.

Да поўдня прыймаюцца толькі па вочным хваробам, каторых ужо ні так многа.

Бедната, ні маючая мажлівасьць пайсьці да платных дохтароў (па 5 р. за візыт), выстаівасць ад 9-ай гадз. з рання у чаканні „дохтара", каб пасьля за дзешоўку атрымаць і лекарство.

Курсы беларусазнаўства.

Сягоння, 24 мая лекцыя С. Ленкоўскаго. «Гісторыя Беларускаго Права».

Пачатак а 7-ай гадзіне.

ПАПРАЎКА — АБМЫЛКІ.

У учэрайшым № 48 «Бел. Шляху» укралася каракктарская абмылка у Хроніцы пад загалоўкам „*Быўшы менскі паліцмэйсиэр Сокалоў*" напісано: „с Харкова у унурэнюю Расію у ролі камісара", трэба чытаць „Харбіна у унутрэнюю Расію у ролі камісіянэра".

Беларуская зямля.

Сыноў гукае, клічэ з сход.
Маць-Беларуская зямля:
«Устань, пакрыўджаны народ,
«Ідзі на родныя паля!
«Лугі акопамі прарыты,
«Людзкімі трупамі пакрыты..
«Усюды горы-курганы,
«Лясы крыжоў-гусьцей, гусьцей.
«Крычаць-галосяць груганы
«На грудах куляў і касьцей».
Земля гавора бы жывая:
«Да працы, шчырыя ратаі! —
«Пара і сеяць і араць,
«У ціхамірнай працы жыць,
«У сярпы мячы перакаваць,
«Балючы раны загаіць!
«Пара адбудаваць руіны
«Па акрываўленай краіне!»

* * *

Гэй, Лях і Рос, тут вам прымус
Ні можа існаваць ані:
У нашым краю беларус —
Гаспадарам зямлі!

Ясакар.

Рэдактар А. Прушынскі.

Выдавецтво Т-во «Заранка».

Друкарня Я. А. Грынблята